# ХРОНИКА НАУЧНОЙ ЖИЗНИ

## II МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І СВЕТ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ»

(Мінск, 15–16 лістапада 2018 г.)

15–16 лістапада 2018 г. кафедра беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ладзіла другую міжнародную канферэнцыю «Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі». Для абмеркавання шырокага кола лінгвістаў і літаратуразнаўцаў прапаноўваліся наступныя навуковыя пытанні:

– культурныя мадэлі і спецыфіка нацыянальных моў і літаратур;
– транснацыянальныя элементы беларускай мовы, літаратуры, культуры;
– лінгвакультурнае ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў у полікультурным асяроддзі;
– сучасныя тэндэнцыі ў методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры як замежнай. Лінгвакультурны аспект у выкладанні беларускай мовы як замежнай;
– пераклад як сродак рэпрэзентацыі беларускай літаратуры ў свеце;
– беларуская мова, літаратура, культура ў кантэксце сусветнага гуманітарнага працэсу;
– беларускі пісьменнік і свет: шлях да сусветнага прызнання;
– беларуская карціна свету: праблемы міжкультурнай камунікацыі;
– кампаратыўнае вывучэнне моў, літаратур, культур;
– праблемы стварэння сучаснага падручніка па беларускай мове, літаратуры, культуры.

У працы канферэнцыі бралі ўдзел навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Іспаніі, Польшчы, Славакіі.

На пленарным паседжанні былі заслуханы даклады Н. Паўлоўскай («Мадэлі канцэптуальных сэнсаў і іх мадальная рэалізацыя ў сучаснай беларускай мове»), А. Краева («Беларуская мова як другая іншаславянская: пытанні рэпрэзентацыі для славацкіх студэнтаў-філолагаў»), В. Барысенка і Л. Кныш («Адукацыйны турызм у Беларусі»), М. Рагачэўскай («Морыс Хіндус піша пра Бацькаўшчыну»), І. Дубянецкай («Новая беларуская біблія: лінгвістычны і літаратурныя аспекты навуковага перакладу»).

Далей праца канферэнцыі працягнулася на секцыях «Беларуская мова і свет», «Актуальныя праблемы беларускай лінгвістыкі», «Беларуская літаратура і свет».

Акрамя таго, пад час працы канферэнцыі адбылася прэзентацыя зборніка навуковых артыкулаў па выніках першай міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі», што адбылася 3 – 4 лістапада 2016 г. і сабрала 70 удзельнікаў з 7 краін свету. Два раздзелы выдання прысвечаны лінгвістычным росшукам: «Беларуская мова ў кантэксце сусветнага гуманітарнага працэсу» і «Актуальныя праблемы лінгвістыкі» (артыкулы В. Барысенка, С. Бут-Гусаім, В. Гапеева, Т. Казакевіч, Л. Кныш, А. Лапцёнак, Н. Старавойтава, А. Строк і інш.). Праблемы айчыннага літаратуразнаўства разгледжаны ў раздзелах «Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнага гуманітарнага працэсу» і «Беларускія пісьменнікі і свет: шлях да сусветнага прызнання» (І. Бурдзялёва, М. Воінава-Страха, А. Карнацкая, Л. Первушына, М. Рагачэўская, Т. Супранкова, З. Траццяк і інш.). Акрамя таго, у зборніку пададзены даклады, заслуханыя ў секцыях «Пераклад як сродак рэпрэзентацыі беларускай літаратуры ў свеце» і «Беларуская культура ў кантэксце сусветнага гуманітарнага працэсу» (Н. Апанасовіч, Г. Басава, Д. Букаеў, А. Ізергіна, Т. Саўчук, А. Таболіч і інш.).

***канд. філал. навук, дац. З.І. Траццяк***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***